УДК 882.6

І.Л. Шаўлякова-Барзенка, дац., канд. філал. навук
(Нацыянальны інстытут адукацыі, г. Мінск)

# МАСТАЦКАЯ (САМА)ІДЭНТЫФІКАЦЫЯ: ТЭАРЭТЫЧНАЯ ЛЕГІТЫМАЦЫЯ ПАНЯЦЦЯ Ў КАНТЭКСЦЕ РАЗВІЦЦЯ НАЙНОЎШАЙ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Больш ці менш выразнае артыкуляванне праблемнага поля "ідэнтычнасць – ідэнтыфікацыя – самаідэнтыфікацыя" ў сучасным беларускім гуманітарным досведзе ажыццяўляецца прыкладна з канца 1980-х гадоў. З другой паловы 1990-х побач з мастацка-публіцыстычнымі (паводле пафасу і стылю) "артыкуляцыямі" з'яўляюцца спробы сфакусаваць увагу зацікаўленай супольнасці на *ідэнтычнасці* як на аб'екце сур'ёзных доследаў (напачатку – філасофскіх, культуралагічных, гістарычных), мэтава арыентаваных на актуальныя аксіялагічныя запыты тагачаснага беларускага грамадства. Паняцце *мастацкай (сама)ідэнтыфікацыі* ўпершыню актуалізуецца намі ў кантэксце аналізу беларускага літаратурнага працэсу як дыялектычнай змены ўстойлівых і пераходных перыядаў.

Адным з найважнейшых вынікаў сітуацыі "пераходнасці" на мяжы XX–XXI стагоддзяў для беларускай мастацкай славеснасці стаўся *крызіс ідэнтычнасці* (аксіялагічнай, эстэтычнай, мастацкай). Агульнакультурныя зрухі ў "глакальным свеце" (дзе побач з працэсамі глабалізацыі разгортваюцца працэсы этнакультурнай лакалізацыі) адным з наступстваў маюць актывізацыю працэсаў *мастацкай (сама)ідэнтыфікацыі* беларускай нацыянальнай літаратуры – як рэакцыі на маштабны крызіс яе ідэнтычнасці.

У працах сучасных айчынных літаратуразнаўцаў лейтматывам гучыць думка пра тое, што ўся новая і найноўшая беларуская літаратура прасякнута пафасам аднаўлення нацыянальнай ідэнтычнасці. Праблема асэнсавання ідэнтычнасці як *самасці* звязана з пошукам у літаратурна-мастацкім дыскурсе своеасаблівай "інтэгратыўнай" мадэлі нацыянальнага быцця, што паўстае гарантам гарантам своеасаблівай нацыянальнай перспектывы. Пад *мастацкай ідэнтычнасцю* літаратуры пэўнага перыяду мы прапануем разумець комплекс эстэтычных, аксіялагічных, духоўна-маральных, сацыякультурных ідэй, арыенціраў і ўстановак, увасабленне якіх у літаратурным працэсе абумоўлівае дамінаванне пэўнага тыпу (ці суіснаванне шэрагу тыпаў) літаратурнай творчасці. Супярэчлівасць сацыякультурных умоў і аксіялагічных фактараў абумоўлівае спецфіку *мастацкай (сама)ідэнтыфікацыі* (як працэсу канстытуявання мастацкай ідэнтычнасці) найноўшай літаратуры.